**Гладкова Ганна Аляксандраўна**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава
e-mail: anngrin@mail.ru

## КАНЦЭПЦЫЯ ГЕРАІЧНАГА ХАРАКТАРУ Ў ТРАГЕДЫІ А. ДЭБІША «БЕЛЫ АРКУШ СЛЯЗА НЕ ЗАПЛЯМІЦЬ»

***Анатацыя.*** У артыкуле на матэрыяле трагедыі Анатоля Дэбіша «Белы аркуш сляза не запляміць» робіцца спроба асэнсавання пісьменніцкай канцэпцыі гераічнага характару. Аналіз вобразнай сістэмы твора дазволіў вылучыць герояў, якія дэманструюць аўтарскае бачанне характару лідара нацыі – вобраз польскага караля Ягайлы і Вялікага князя Вітаўта. У артыкуле на аснове аналізу мастацкіх прыёмаў вылучаны як агульная рысы характараў герояў, так і адметнасці, якія дазваляюць асэнсаваць праблему чалавек-улада, а таксама раскрыць ролю асобы ў гісторыі.

***Ключавыя словы:*** Вялікае княства Літоўскае, Каралеўства Польскае, Тэўтонскі ордэн, жанр, вобраз, характар, стыль.

**Hanna Hladkova**
Vitebsk State University named after P. M. Masherov
e-mail: anngrin@mail.ru

## THE CONCEPT OF A HEROIC CHARACTER IN THE TRAGEDY OF A. DEBISH «A TEAR CANNOT STAIN A WHITE SHEET»

***Abstract.*** In the article, based on the material of Anatoly Debish’s tragedy «a tear cannot stain a white sheet», an attempt is made to comprehend the writer’s concept of a heroic character. The analysis of the figurative system of the work allowed us to identify the characters demonstrating the author’s vision of the character of the leader of the nation-the image of the Polish King Jagiello and Vytautas the Great. Based on the analysis of artistic techniques, the article highlights both the general features of the characters’ characters and the features that make it possible to comprehend the problem of man-power, as well as to reveal the role of personality in history.

***Keywords:*** Grand Duchy of Lithuania, Kingdom of Poland, the Teutonic Order, genre, image, character, style.

Анатоль Дэбіш – сучасны беларускі паэт, аўтар шэрагу паэтычных кніг для дарослых і дзяцей, творчасць якога яшчэ чакае паўнавартаснага літаратуразнаўчага разгляду. У літаратурнай спадчыне пісьменніка ёсць трагедыя «Белы аркуш сляза не запляміць» (2017), напісаная на вядомы беларускі гістарычны сюжэт. Аўтар вызначыў жанр твора як трагедыю, што прадвызначана канфліктам, а таксама

наяўнасцю герояў, здольных на глыбокае перажыванне ва ўласным, часам супярэчлівым, імкненні да мэты.

Сыходзячы з драматычнай калізіі, жанравую мадыфікацыю трагедыі «Белы аркуш сляза не запляміць» можна акрэсліць як трагедыю нацыянальна-гістарычную.

Драматург звярнуўся да вядомых падзей гісторыі другой паловы XIV – пачатку XV стст., калі на палітычнай арэне ўзмацнілася роля Ягайлы, ён становіцца польскім каралём і заснавальнікам дынастыі Ягелонаў. Складаныя стасункі з сынам Кейстута Вітаўтам, знішчэнне палітычных супернікаў на сваім шляху да адзінаўладнага кіравання становяцца асновай калізіі п’есы.

Заўважым, што на пачатку дзеі першай пазначана, што *«дзеянне адбываецца […] напрыканцы XIII пачатку XIV стагоддзяў»* [1, с. 93]. Аб’ектыўна такая мастацкая фактлогія не супадае з гістарычнай, тым больш, што ў п’есе дзейнічаюць рэальныя гістарычныя асобы (Кейстут, Ягайла, Вітаўт, Ядвіга, Скіргайла і інш.), згадваецца Грунвальдская бітва, якая адбылася ў 1410 годзе, такім чынам, аўтарская рэмарка патрабуе ўдакладнення.

Ядро канфлікта – сутыкненне двух характараў (Ягайла-Вітаўт), аднак у наяўнасці таксама і ўнутраны канфлікт у душы кожнага героя, звязаны з прыманнем рашэнняў маральнага ўзроўню.

Першая дзея пачынаецца з канстатацыі Ягайлам пасля смерці бацькі (князя Альгерда) свайго права на пасад, што пацвярджаюць словы Кейстута *(«Па волі ён Альгерда / Прызначаны быць князем»*) [1, с. 94]. Пазіцыя Ягайлы – шукаць прыхільнікаў – абумоўлена сур’ёзнай знешняй пагрозай і адсутнасцю дастатковай ваеннай сілы *(«Бяды не абміну, / Калі не буду з Кейстутам у саюзе»*), аднак рашучы характар і амбіцыі ў хуткім часе змяняюць меркаванне князя (*«Без Кейстута мне не ступіць і кроку, / Ды з ім дзяліцца ўладай – не з рукі»*), Ягайла жадае пазбавіцца ад вопытнага суперніка і для гэтай мэты не грэбуе ніякімі сродкамі. Рысы тырана акцэнтуюцца ў характары героя ўсё больш (*«Я – сам закон пад гэтым вечным небам […] / Бо я – адзіны бог тут на зямлі»*). Падман і хітрасць – прымальныя сродкі для Ягайлы ў палітычнай барацьбе, што, нарэшце, прыводзіць яго апанентаў, Кейстута і Вітаўта, да рашэння вызваліць Ягайлу ад княжацкіх абавязкаў.

У дзеі другой праз успаміны Кейстута падкрэсліваецца міласэрнасць характару Вітаўта, якая праяўлялася ўжо ў дзіцячыя гады. Відавочна, што лідар нацыі павінен валодаць і гэтай якасцю, што будзе засцерагаць героя ад празмернай амбіцыйнасці і дазволіць служыць на карысць айчыны.

Для вяртання ўлады Ягайла не грэбуе змовай з крыжакамі. Відавочна, што для героя ўласныя амбіцыі першасныя перад інтарэсамі дзяржавы. Учынак героя падмацоўвае яго пазіцыя: «*У каго ёсць болей золата і срэбра, / Таму і будзе слугаваць народ»* [1, с. 117]. Па адной з версій Ягайла меў прамое дачыненне да смерці Кейстута, А. Дэбіш падтрымлівае гэты варыянт развіцця гістарычных

падзей, Ягайла ўпэўнены, што «дзве смерці» народ не зразумее, нават калі яны будуць «выпадковымі».

Расправа з Кейстутам і яго жонкай Бірутай была здейснена рукамі Скіргайлы (*«Загінуў смерцю лютай… / Я думаў, што вяроўку разарве»*) [1, с. 124]. Так у трагедыю ўваходзіць матыў палітычнага забойства, якое кладзецца на сумленне Ягайлы. Амбіцыі героя знаходзяць прыдатную глебу ў прапанове польскіх паслоў узяць шлюб з польскай каралевай Ядвігай. Ягайла пагадзіўся з перспектывай хуткага аб'яднання Польшчы і Літвы, ажаніўся з Ядвігай і прыняў каталіцтва. Для героя на першым месцы стаяць яго мэты і жаданні, так, пасля прызнання жонкі, што яна не кахае мужа, а «належыць Польшчы», Ягайла вырашае *прымусць* Ядвігу быць пакорлівай і служыць яго волі.

Такім чынам, Ягайла паказаны ў творы чалавекам з моцнай воляй, эгаістычнымі памкненнямі і празмернымі амбіцыямі. Герой не спыніцца ні перад чым на шляху да сваёй мэты, ён не пагарджае прымусам, забойствам, зменай спрадвечнай веры бацькоў і суайчыннікаў. Гэта асоба моцнага лідара, аднаасобніка, схільнага да тыраніі *(«Хачу – узвышу! / Захачу – знявечу!»*) [2, с. 247].

Палітычны апанент Ягайлы – яго стрыечны брат Вітаўт – паказаны ў п'есе як дыяметральна супрацьлеглы характар: міласэрны з дзяцінства (часта хварэў, рос слабым, ашчадна ставіўся да жывёл), спагадлівы да любай жонкі, верны сын сваёй айчыны. І Ягайла, і Вітаўт, бясспрэчна, мужныя ваяры, аднак, калі Ягайла больш заняты рэалізацыяй уласных жаданняў, Вітаўт паказаны як кіраўнік, які больш клапоціцца пра інтарэсы радзімы. У размове з жонкай князь кажа: «*Не толькі я табе – Літве належу*» [2, с. 272]. Вітаўт таксама разумее, што адзінаўладдзе здолее ўзмацніць родны край, паказальна, што яго характарыстыка вобраза лідара нацыі ўтрымлівае ў першую чаргу якасці «справядлівы» і «магутны», які здолее «сабраць усіх у кулак». Менавіта такім князем стане Вітаўт – мужным, справядлівым, здольным узмацніць краіну і прывесці яе да росквіту. Паказальна, што для князя Літвы першаснае значэнне мае самапачуванне народа і яго права самастойна вырашаць справы («*У свёй краіне – спадары мы самі, […] / Не быдла мы нікчэмнае, / Мы – людзі*») [2, с. 275].

Перад знешняй пагрозай Тэўтонскага ордэна абодва героі разумеюць, што адзінае выйсце – аб'яднанне ваеннай моцы абедзвюх дзяржаў. Замірэнне Вітаўта і Ягайлы – гэта палітычная неабходнасць, перад якой прыватныя канфлікты сыходзяць на другі план.

Пасля перамогі ў характары Вітаўта пераважаюць рысы дзяржаўнага чалавека: герой імкнецца сцвердзіць незалежнасць Літвы, насельніцтва якой не стане пакланяцца нікому, «ані ляхам, ні табе» (маецца на ўвазе Ягайлу). Мары Вітаўта – гэта спадзяванні на мірнае жыццё радзімы, каб край «багацеў і квітнеў з года ў год», жыў самастойна, не па чужой волі, а па сваёй. Вітаўта больш не задавальняе ўнія, ён разумее, што незалежнасць Літвы ўяўная, таму герой прагне *«прымерыць*

*каралеўскую карону на сябе»* [2, с. 288]. Паказальна, што кіруюць Вітаўтам не ўласныя эгаістычныя памкненні, ён думае пра Літву, якая здолее ў такім выпадку заняць сваё пачэснае месца між еўрапейскімі народамі.

Фінал п'есы адпавядае жанру: карону Вітаўту атрымаць не давялося, герой памірае з апошнім словам аб тым, што *«той, хто радзіўся ліцвінам –/ Палякам не стане ніколі!»* [2, с. 291].

Такім чынам, параўнальны аналіз вобразаў Ягайлы і Вітаўта дазваляе зрабіць наступныя высновы: па-першае, аўтар трагедыі абапіраецца на факты гісторыі пры стварэнні характараў герояў. Па-другое, дадзеныя вобразы знаходзяцца ў канфліктным становішчы, што прадыктавана, у першую чаргу, палітычнымі інтарэсамі і барацьбой за ўладу. Па-трэцяе, супрацьлегласць характараў Ягайлы і Вітаўта дэманструюць два аўтарскія падыходы да асобы лідара нацыі: за аднаго боку, гэта вобраз кіраўніка з тыранічнымі паводзінамі, прагай да адзінаўладдзя, амбіцыямі і нават жорсткасцю (Ягайла), з другога боку – гэта вобраз справядлівага, гуманнага лідара-патрыёта, для якога шчасце айчыны першаснае перад уласнымі жаданнямі (Вітаўт). Паказальна, што і адзін герой, і другі здольныя да сумеснай дзейнасці, замірэння і аб'яднання перад знешняй пагрозай, аднак як толькі перамога над ворагам была атрыманая, зноў узмацніліся супярэчнасці прыватнага характару, якія аддаляюць герояў.

А. Дэбіш выкарыстаў прыём паказу герояў не толькі ў грамадскіх, але і ў сямейных стасунках, пры гэтым Вітаўт у адносінах да Ганны паказаны больш пяшчотным, кахаючым. Эмацыянальны цэнтр трагедыі – узнёслы дыялог закаханых, у якім Вітаўт праяўляе лепшыя якасці душы, а яго жонка дапаўняе галерэю мастацкіх жаночых вобразаў, якія ўвасобілі верных спадарожніц жыцця мужных ваяроў.

Яшчэ адзін важны момант – вера герояў. Ягайла ў залежнасці ад палітычнай мэты пераходзіць у каталіцтва («*Паганскай веры я знішчу плоць / А душу ці змагу?*»), Вітаўт прытрымліваецца веравызнання продкаў. Удалым прыёмам раскрыцця сутнасці персанажа стала ўвядзенне ў сюжэт сну Ягайлы. Герой бачыць здань Вітаўта, які пільна ўзіраецца ў твар героя і не знаходзіць там душу. Так сімвалічна драматург паказаў розніцу паміж героямі, дапоўніў іх партрэты, акрэсліў каштоўнасці.

Трагедыя А. Дэбіша «Белы аркуш сляза не запляміць» стала ўдалай спробай рэканструкцыі гісторыі, мастацкім асэнсаваннем праблемы *чалавек і ўлада* ў кантэксце падзей XIV – пачатку XV стст. Думаецца, што сучасная драматургія працягне аднаўляць старонкі беларускай мінуўшчыны, што бачыцца актуальным напрамкам сучаснай нацыянальнай літаратуры.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Дэбіш, А. Белы аркуш сляза не запляміць / А. Дэбіш // Тэрмапілы. – 2017. – № 21. – С. 93–125.
2. Дэбіш, А. Белы аркуш сляза не запляміць / А. Дэбіш // Тэрмапілы. – 2018. – № 22. – С. 238–291.